Магілеўскі
ВЫБАР
№ 2 (40)
Студзень
2015 г.
Абласная Дэмакратычная Трыбуна

Абмеркавалі праблему карупцыі



У Магілёве 11 студзеня адбыўся чарговы круглы стол, прысвечаны праблемам карупцыі, стану эканомікі і рэфармаванню сельскагаспадарчых прадпрыемстваў у Магілёўскай вобласці.

Сустрэча прайшла ў памяшканні грамадскага цэнтра “Кола”, арганізавалі мерапрыемства Выдавецкі цэнтр Магілёўскай рэгіянальнай кааліцыі дэмакратычных сіл і сябры ГА “БАЖ” Магілёўскай вобласці. Удзел у круглым стале ўзялі журналісты і грамадскія актывісты з розных рэгіёнаў Магілёўшчыны, у якасці экспертаў выступалі спецыялісты ў галіне сельскай гаспадаркі. Усяго ў сустрэчы прыняло ўдзел больш за 20 чалавек.



Пётр Мігурскі

Падчас сустрэчы эксперты зрабілі аналіз прычын росту карупцыйнай злачыннасці на прыкладзе розных раёнаў Магілёўскай вобласці, а такскама выказалі сваё гледжанне на стан эканомікі і праблемы рэфармавання сельскагаспадарчых прадпрыемстваў Магілёўшчыны.


Кандыдат эканамічных навук Пётр Мігурскі засяродзіў увагу прысутных на тым, што тэма карупцыі патрабуе пастаяннай увагі і сістэмнай працы з боку грамадскасці, бо гэта з’ява мае глабальныя наступствы для нацыянальнай эканомікі. Не такая “бяскрыўдная” карупцыя і на рэгіянальным узроўні – з “дапамогай” недабрасумленных чыноўнікаў рэалізуюцца неэфектыўныя інвестыцыйныя праекты, дэфармуецца структура дзяржаўных расходаў, дэзынфармуецца вертыкаль улады, зніжаюцца даходы законапаслухмяных грамадзян. Пётр Сцяпанавіч выказаў меркаванне, што карупцыйныя злачынствы шмат у чым правакуюцца існуючай сістэмай улады ў краіне і прывёў канкрэтныя сведчанні гэтага на прыкладзе Шклоўскага раёна. У прыватнасці, спадар Мігурскі спыніўся на тым, што ў Шклове па-ранейшаму практыкуецца практыка прызначання на пасады раней асуджаных чыноўнікаў, а таксама пра чарговыя карупцыйныя скандалы ў кіраўніцтве Шклоўскага раёна (былы першы намеснік старшыні Шклоўскага райвыканкама Дзмітрый Мінянкоў асуджаны да 14 гадоў пазбаўлення волі за крадзёж сродкаў на закупку жывёлы ў памеры 4,2 млн. еўра, іншы намеснік старшыні райвыканкама Яўгеній Семянковіч знаходзіцца пад следствам за махінацыі з жыллём).

Карупцыянеры сваёй злачыннай дзейнасцю падрываюць давер да дзяржаўнай улады. Ці зможа існуючая ўлада падужаць ёй жа створаную карупцыйную сістэму? П.Мігурскі лічыць, што наўрад – стаўка на дзяржаўную ўласнасць, аграмадныя сродкі ў руках чыноўнікаў, залежныя суды і сродкі масавай інфармацыі – усё гэта працуе на беспакаранасць чыноўнікаў.

Іншыя дакладчыкі – Рыгор Кастусёў, Мікалай Гердзій і Андрэй Юркоў – таксама выказалі свае меркаванні наконт неабходных захадаў па недапушчэнні карупцыйных злачынстваў у нашым грамадстве, а таксама прааналізавалі стан эканомікі сельскай гаспадаркі Магілёўскай вобласці і перспектывы яе развіцця ў 2015 годзе.

Удзельнікі круглага стала таксама выказвалі свой пункт гледжання на тое, што патрэбна зрабіць для забеспячэння пастаяннага кантролю з боку грамадзянскай супольнасці за органамі ўлады ў рэгіёнах. Прысутныя на сустрэчы журналісты рэгіянальных маланакладных выданняў адзначылі, што матэрыялы на тэмы карупцыі, якія друкуе незалежнае прэса, заўсёды цікавыя чытачам, бо раённыя дзяржаўныя СМІ звычайна гэту тэму замоўчваюць.

Наступны круглы стол, прысвечаны праблемам карупцыі і рэфармавання сельскагаспадарчых прадпрыемстваў у Магілёўскай вобласці, удзельнікі сустрэчы дамовіліся правесці вясной 2015 г.



Рыгор Кастусёў

Паводле spring96.org/

Даклады П.Мігурскага і Р.Кастусёва друкуюцца ў гэтым нумары “МВ”

Коррупция: вертикальные дефиниции

***Дефиниция** (лат. definitio - определение) - логическое определение понятия, его отличительных признаков.*

Тема коррупции требует постоянного внимания и системной работы – явление, полностью формирующееся «человеческим фактором», имеет глобальные последствия для национальной экономики. Не так «безобидна» коррупция и на региональном уровне – с «помощью» недобросовестных чиновников реализуются неэффективные инвестиционные проекты, деформируется структура государственных расходов, дезинформируется вертикаль власти, снижаются доходы законопослушных граждан.

Сила местной власти в способности преломления большинства президентских новаций в свою пользу как в социальном, так и экономическом, направлениях. Громкие коррупционные дела, инициированные лично А.Лукашенко и его администрацией, не совсем удачны по подбору фигурантов-преступников, в то время как истинные коррупционеры продолжают определять тормозной путь страны. Не удивительно, что из 900 коррупционных злодеяний за 9 месяцев 2014 г. большинство зафиксировано в сферах здравоохранения и системы образования. Пресекать злодеяния врачей-вредителей, конечно, необходимо, а сам вопрос нужно рассматривать в первую очередь с точки зрения общественной опасности совершаемых деяний. Вред от выдачи фиктивных больничных, заключений о результатах обследований на предмет пригодности к управлению транспортными средствами, работе в сфере торговли и общепита очевиден. Но это все так называемая бытовая коррупция.

Вопрос гораздо сложней – врач тоже берет взятки на подготовленной «почве». Терпимость общества к подобного рода преступлениям формируется не в одночасье, а вот провоцирование коррупции самой системой власти – очевидно.

В структуре района процесс создания преступной вертикали длится примерно 2 года, в течение которого идет селекция всех без исключения – от председателя райисполкома до председателя сельсовета. Сдерживающий фактор – работа силовых структур и отсутствие покровителя в вышестоящей вертикальной структуре. Ряд коррупционных скандалов в Шкловском районе подтверждают данное наблюдение – все осужденные чиновники проработали на своих должностях около 2 лет, прежде чем решились на присвоение крупных сумм денег. Снижение показателей района по инвестициям, сельскохозяйственному производству в предыдущие годы указывает на переориентацию внимания районного руководства только на определенные результаты, интересные личной выгодой. По сути, поневоле, в силу ограниченной способности к государственной службе областного масштаба, опосредованно способствует подобным деяниям шкловской «верхушки» главный контролер по Могилевской области Г.Лавренков. Это под его кадровым «крылом» смог стать начальником управления сельского хозяйства и продовольствия Д.Миненков, недавно осужденный к 14 годам лишения свободы за беспрецедентное по масштабу воровство средств в размере в 4,2 млн. евро. Это с его молчаливого согласия несколько лет шкловским ЖКХ руководили судимые начальники. Это с его разрешения сегодня одним из заместителей председателя Шкловского райисполкома утвержден судимый в прошлом М.Павлович. Чувство безнаказанности и иллюзия высокого покровительства прервали карьеры бывших чиновников районного масштаба – управляющей делами райисполкома Л.Гляковой и зам. председателя райисполкома Е.Семенкевича. Чистыми из «коррупционной воды» пока выходят руководители хозяйств (исключение - бывший директор ОАО «Александрийское» В.Дюрдь), но более детальное исследование «калийного дела», скорее всего, одного из них отправит в «кутузку» - аферу с экспортом «бюджетных» удобрений без участия высокопоставленных лиц провернуть в районе просто невозможно.

Коррупционеры своей преступной деятельностью подрывают доверие людей к государственной власти, ставят под сомнение легитимность власти, а это «батькой» не прощается - так что Шкловский район еще ждут «громкие» дела.

Кстати, местные борцы с коррупцией истинную коррупцию в упор не замечают – например, на координационном совещании по борьбе с преступностью и коррупцией при прокуроре Шкловского района еще в ноябре 2014 года были озвучен ряд фактов нарушений соответствующего Закона Республики Беларусь. Так вот, прокурорские проверки показали, что преступники в районе окопались в системе образования и организациях, подчиненных концерну «Беллесбумпром». А где же преступники из райисполкома, которые наворовали денег, удобрений и прихватизировали ряд квартир? При этом, рядовые шкловчане этих же квартир лишились.

Пострадали шкловчане-очередники на жилье и от конкретных действий работника УКСа райисполкома. Генеральный директор могилёвского ООО «Стройинвест» уже в период неплатежеспособности организации заключил договоры на выполнение строительно-монтажных работ по строительству 80-квартирного жилого дома в Шклове. При этом, КУП «УКС Шкловского райисполкома» перечислил аванс на строительство дома 2 млрд. руб., из которых

фактически освоено было только 290 млн. рублей. А что, специалисты УКСа не могли поинтересоваться возможностями ООО в производстве работ, его финансовым состоянием? Или 2 млрд. рублей для чиновников такая мелочь, что сильно о судьбе денег беспокоиться не стоит? Явно просматривается личный интерес работника УКСа и подобные действия уже получили тюремное измерение. Районное же начальство от преступных действий подчиненного не пострадало.

Шкловские борцы с коррупцией не одиноки в столь «высокой» эффективности борьбы с явлением. Вот, например, поборолись с коррупцией в Климовичах, так поборолись! *«За 9 месяцев 2014 года в Климовичском районе выявлено 5 преступлений коррупционной направленности,* – с гордостью отмечает прокурор Сергей Рашук**.** *– Прокуратурой района проведено 5 проверок исполнения антикоррупционного законодательства. Для устранения выявленных нарушений руководителям предприятий и организаций района внесено 7 представлений и вынесено 4 предписания. 7 лиц официально предупреждены о недопустимости нарушения закона, еще 16 человек по требованию прокурора привлечены к дисциплинарной ответственности, 4 – к материальной. Виновными лицами возмещен ущерб на сумму более Br10 млн.».* И предложил: с целью эффективного противодействия коррупционным преступлениям проводить на системной основе профилактические мероприятия, в том числе осуществлять контроль за подбором и расстановкой кадров, соблюдением ограничений и требований антикоррупционного законодательства, исключить факты использования должностными лицами материальных ресурсов организаций в личных целях. И сделал это предложение не в кулуарах, а на заседании райисполкома, где главным вопросом повестки дня как раз и стало соблюдение законодательства о борьбе с коррупцией и сохранности собственности. Думаю, что местные коррупционеры действиями прокуратуры и предложениями остались весьма довольны.



Полыковичи – деревня, которая почти вся видна из Могилева. Казалось бы, всё в ней должно соответствовать ответственной близости к областному центру. Ан, нет - деревня неряшливая, замусоренная, от работы подпольных автомастерских «прыгает» напряжение в сети, борьба с негативом, в том числе и воровством, не ведется. Вышестоящие исполкомы завалены жалобами на местную власть, а меры пока не принимаются. Дело в том, что беспредел в д.Полыковичи порожден именно местными чиновниками: Полыковичи – рай для них. Дачи областных чиновников, полученные не без помощи местной власти, рядом с городом... Также, отмечены родственные отношения местного начальства с некоторыми представителями областного истеблишмента, разрубить которые было не под силу даже губернатору. Это где же видано, чтобы потомки полицаев, облеченные властью, сегодня угнетали детей партизан и воинов Красной Армии?! Да, да, и это есть в Полыковичах! Кстати, в аппарате Могилевского райисполкома выявлено ранее судимое лицо, – неужели без уголовников во власти этой власти не обойтись?..

Корни проблем – в бессовестности власти, в безнаказанности дорвавшихся до «корыта», как любит повторять Президент, *людишек*, которые превратили дарованные верхней властью должности в доходные места. Без демократии, без учета мнения народа в подборе руководящих кадров, падать показателям Могилевского района еще долго. Благо, прежние руководители района и области упорным трудом, бескомпромиссностью и строгостью вывели его на достойные высоты.

Возьмем масштаб покрупнее. На ОАО "Могилевхимволокно" разгорается скандал вокруг проекта по производству упаковочной пленки. Новый импортозамещающий продукт - лучший по качеству и цене - должен был стать востребованным на рынке. На деле от новой пленки отказываются даже компании, сделавшие предварительный заказ. Дорогостоящее оборудование, купленное специально под проект, остановлено, а на заводе пытаются разобраться – кто же виноват в срыве планов. А проект ведь согласовывался на уровне правительства, обоснование готовилось на предприятии, обсуждалось в местной вертикали. В итоге – впустую потраченные деньги, загруженные склады, проблемы с доходами работников и бюджета. Кто ответит за результат? И не виднеются ли из этого проекта уши личного интереса?

А действия бывшего гендиректора "Кричевцемент-

ношифера" Леонида Скоцкого, обвиненного в злоупотреблении служебными полномочиями и взяточничестве. Напомним: по данным следствия, Л.Скоцкий незаконно получил в общей сложности 214 миллионов рублей. Следователи установили, что он причастен к 12 эпизодам поборов денежных средств с премий заводчан. Получая около 30 миллионов рублей заработной платы, бывший директор не гнушался взятками в 20 долларов. Кроме того, по данным следствия, он питался в заводской столовой, не платя за свой обед, - это делали за него работники предприятия. Во время следствия был наложен арест на квартиру Скоцкого в Могилеве и автомобиль Volkswagen стоимостью 45 тысяч долларов. В ходе обыска по месту его жительства в Кричеве было изъято 3 миллиона российских рублей. Общая сумма денежных средств и имущества, на которые наложен арест, превысила 1 миллиард 670 миллионов рублей. Сколько еще нужно таким людям?

Комитет госконтроля при проверке ОАО «Бобруйский мясокомбинат» выявил вопиющие факты нарушения законодательства. При наличии задолженности перед бюджетом и сельхозпроизводителями, руководство мясокомбината умудрилось предоставить «кредиты» зарубежным партнерам в объеме 180 млн. российских рублей. Кроме того, при строительстве мясожирового цеха объем выполненных работ был завышен на 600 млн. рублей. 4 человека оштрафовано (!).

Сотрудница быховского банка присвоила более Br1 млрд вкладов пожилых людей. Следствием установлено, что 45-летняя жительница Быховского района, работая в должности специалиста по оказанию розничных банковских услуг отделения одного из банков города и являясь материально ответственным лицом, осуществляла оформление и заключение от имени банка договоров по вкладам населения. Будучи осведомленной в силу возложенных на нее обязанностей о наличии денежных средств на счетах вкладчиков, путем оформления подложных расходных кассовых ордеров она присвоила размещенные в банке денежные средства.

Разные примеры, разные последствия, но во всех случаях впечатляют масштабы злоупотреблений. И когда идет разговор о проблеме сотни тысяч рублей, так нужных в виде добавки к зарплате рядовых работников, на фоне тотального воровства «вертикальщиками» или руководителями, прошедших согласование на должность в Администрации Президента, возникает мысль о порочности всей системы государственной власти. Так что дефиниции, касающиеся коррупции, у народа и у власти несколько различаются.

В 2013 году в Беларуси было зарегистрировано 2301 коррупционное преступление, что на 29,3% больше по сравнению с предыдущим годом. В подавляющем большинстве это факты взяточничества, злоупотребления властью, а также хищения путем злоупотребления служебными полномочиями.

В ежегодном отчете международного движения по противодействию коррупции Transparency International "Индекс восприятия коррупции" Беларусь в этом году набрала 31 балл и заняла 119-е место (вместе с Мозамбиком, Сьерра-Леоне, Танзанией и Вьетнамом). В прошлом году наша страна с 29 баллами была на 123-ем месте. Россия заняла 136 место (27 баллов), Украина – 142 место (26), Казахстан – 126 место (28). Поздравляем с успешным продвижением в турнирной таблице!

Сможет ли эта власть побороть ей же порожденную коррупционную систему? Вряд ли: ставка на госсобственность, огромные средства в руках чиновников, отсутствие политической состязательности, зависимые суды и средства массовой информации – всё работает на безнаказанность чиновников.

Что делать? Боюсь, что при этой власти любые действия будут носить декоративный характер. Впрочем, посмотрим - очистят ли властные коридоры от судимых чиновников в Могилевском и Шкловском районах в свете действия Декрета Президента № 5 от 15 декабря 2014 г. «Об усилении требований к руководящим кадрам и работникам организаций», в котором пунктом 6.23. предписано увольнять с госслужбы чиновников, имеющим непогашенную или неснятую судимость. Впрочем, наши герои судимость погасили и имеют полное право управлять государственной политикой и несудимыми гражданами.

Пётр МИГУРСКИЙ.

АДУСЮЛЬ ПАКРЫХУ

Эканамічны суд Магілёўскай вобласці прыняў рашэнне аб прызнанні эканамічна неплацежаздольным Бабруйскага завода напояў. Паводле інфармацыі прэс-службы Вярхоўнага суда, у ходзе адкрытага судовага пасяджэння быў разгледжаны праект санацыі прадпрыемства, які прадугледжвае комплекс мерапрыемстваў па ліквідацыі існуючай запазычанасці ў суме 55 мільярдаў рублёў.

Асноўная прадукцыя завода - безалкагольныя напоі, пладовыя віны, хлебны квас. Па выніках судовага паседжання ў дачыненні да прадпрыемства ўведзена працэдура санацыі тэрмінам на 18 месяцаў.

У 2014 годзе ўсімі нарыхтоўчымі арганізацыямі вобласці ў гаспадарках насельніцтва закуплена 5,8 тыс. галоў буйной рагатай жывёлы. Найбольшая колькасць - ў Бабруйскім раёне (0,7 тыс.галоў). У цэлым па вобласці закупкі буйной рагатай жывёлы скараціліся ў параўнанні з 2013 г. на 35,5%. Памяншэнне аб'ёмаў такіх закупак назіраецца ва ўсіх раёнах вобласці, найбольш значнае ў Хоцімскім раёне (на 56,1%), у Мсціслаўскім раёне на 49,4%, у Магілёўскім - на 48,1%. Закупкі малака ў гаспадарках насельніцтва ў 2014 г. ў цэлым па вобласці скараціліся на 16,4% і склалі 22 тыс. т. Закупкі малака ў гаспадарках насельніцтва скараціліся ва ўсіх раёнах вобласці.

Аналіз і перспектывы

Што чакае эканоміку Магілёўскай вобласці ў 2015 годзе?

На пачатку новага 2015 года прапаную правесці аналіз, як жа спрацавала Магілёўская вобласць за мінулы 2014 г. і што нас чакае ў бліжэйшай перспектыве. Лічбы і высновы, якія я прывяду далей, абапіраюцца толькі на статыстычныя дадзеныя за 9 месяцаў мінулага года, размешчаныя ў рэспубліканскіх СМІ. Статыстычныя дадзеныя па выніках працы за 12 месяцаў 2014 г. яшчэ адсутнічаюць. Але ў параўнанні з 2013 г. яны будуць мала чым адрозніваццa ад паказчыкаў за студзень-верасень, а калі крыху і зменяцца, то яшчэ больш у горшы бок.

Згодна статыстычных дадзеных за 9 месяцаў мінулага года Магілёўская вобласць змінусавала амаль па ўсіх асноўных паказчыках. Так, аб'ём выпрабленага валавога прадукту склаў усяго толькі 96,8% да адпаведнага перыяду 2013 года. Экспарт тавараў – 94%.

Нават у пытаннях спорту, па выніках гульні хакейных, футбольных каманд вобласці ў вышэйшых дывізіёнах краіны, Магілёўшчына мае найгоршыя паказчыкі за ўсе гады нашага стагоддзя.

Найгоршыя вынікі вобласць атрымала ў сельскай гаспадарцы, асабліва ў жывёлагадоўлі. Так, надой малака на 1 карову за 9 месяцаў 2014 года склаў 3173 кг малака, што на 56 кг меней чым за адпаведны перыяд 2013 г. Агульная вытворчасць малака за 9 месяцаў склала 540250 т, што адпавядае 98,8% да ўзроўню 2013 г.

Сярэнесуткавая прывага БРЖ - 555 гр., што меней на 26 гр. да 2013 г., свіней – 531 гр. – зніжэнне на 5 гр.

Вельмі страката выглядаюць паказчыкі па вытворчасці прадукцыі жывёлагадоўлі сярод раёнаў Магілёўскай вобласці на фоне ўсіх 118 раёнаў Беларусі. Калі па надоях малака на 1 карову Кіраўскі раён уваходзіць у дзясятку лепшых па краіне з паказчыкам 4421 кг, то ў Краснапольскім гэты паказчык склаў 1848 кг (-139 кг да ўзроўню 2013 г.), а ў Крычаўскім - 1781 кг. Абодва гэтыя раёны ўвайшлі ў тройку аўтсайдэраў згодна рэспубліканскай выніковай табліцы. А Крычаўскі раён наогул заняў апошняе месца па краіне.

Бялыніцкі раён з паказчыкам 4204 кг на 1 карову займае 16 радок сярод раёнаў краіны, Магілёўскі – 38 месца (3665 кг), Шклоўскі толькі 52 месца (3438 кг). І гэта пры тым, што ў Шклоўскі раён на працягу апошніх 2-х дзесяткаў год для развіцця сельскагаспадарчай вытворчасці накіроўваліся велізарныя фінансавыя сродкі. Па надоях малака Шклоўскі раён выглядае горш і Круглянскага раёна (44 радок), Клічаўскага (43), Горацкага (27).

Асабліва трывожная сітуацыя склалася ў свінагадоўлі. У 2014 годзе цалкам ліквідавана пагалоўе свіней ў "Амкадор-Шклоў" Шклоўскага раёна, хоць на пачатак года яно складала 2645 галоў. У сельгаспрадпрыемстве "Светлы" Чэрыкаўскага раёна ў верасні 2014 г. заставалася толькі 7608 галоў свіней, што складае толькі 23% да 2013 г. У СПК "Антонаўскі" Чавускага раёна – 8574 гал. – 69% да 2013 г., "Племзавод "Леніна" Горацкага - 4650 – 40%. Агракомплекс "Огнеўскі" Слаўгарадскага - 13729, што адпавядае 56% да 2013 г. У "Палыкавічах" Магілёўскага - 6709 галоў – 80%.

І калі наконт зніжэння пагалоўя свіней мясцовыя ўлады шукаюць апраўданне праз наяўнасць у вобласці АЧС (афрыканскай чумы свіней), то чым можна апраўдаць правалы на комплексах па вырошчванню і адкорму буйной рагатай жывелы?

Так, у ААТ "Александрыйскае" Шклоўскага раёна на 01.10.2014 года знаходзілася 2469 галоў БРЖ, што да адпаведнага перыяду 2013 г. склала толькі 87%. У ЗАТ "Славені" гэтага ж раёна 3030 гал. – 86%. СВК "Звезда-Агра" Крычаўскага – 1838 гал. – 67%, СВК "Следзюкі" Быхаўскага - 2570 – 53%. І г.д.

Правал у эканоміцы вобласці праглядаецца ў першую чаргу з-за адсутнасці сістэмнага падыходу ў падборы кадраў. Гэта нават прызналі ўдзельнікі нарады, што праводзілася ў Магілёве ў час наведвання Аляксандрам Лукашэнка Магілёўшчыны 5 лістапада 2014 года.

У звязку з гэтым ім і было прынята рашэнне па замене старшыні Магілёўскага абласнога выканаўчага камітэта. Але ці дасць станоўчыя вынікі замена кіраўніка вобласці?

На маю думку – не. Бо без наладжвання сістэмнага падыходу ў падборы і падрыхтоўцы кадраў, без рэфармавання эканомікі, зменаў да лепшага не адбудзецца. У 2015 годзе нас чакае далейшае пагаршэнне сітуацыі ў эканоміцы вобласці, асабліва ў сельскай гаспадарцы - вытворчасці прадукцыі жывёлагадоўлі. На працягу 2015 г. нават не ўдасца аднавіць неабходны узровень пагалоўя жывёлы, каб атрымаць станоўчыя вынікі па аднаўленні аб'ёмаў вытворчасці.

Рыгор КАСТУСЁЎ.

Па інфармацыі кіраўніцтва Клімавіцкага райвыканкама, новыя буйныя сельскагаспадарчыя комплексы па вытворчасці свініны і мяса індычкі мяркуецца пабудаваць у бліжэйшы час на Клімаўшчыне. Індычную ферму з 18-тысячным гадавым аб'ёмам выпуску мясной прадукцыі плануецца ўзвесці з прыцягненнем сродкаў прыбалтыйскага інвестара. Будаўніцтва ж свінакомплекса коштам 440 млрд. руб., магчыма, стане адным з мерапрыемстваў новай дзяржпраграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця паўднёва-ўсходніх раёнаў Магілёўшчыны да 2020 г., зацвярджэнне якой чакаецца ў хуткім часе.

Ток глухарей

Живёт в глухих заповедных лесах такая птица, как глухарь. Человеку очень сложно подобраться к ней незаметно. Но бывают периоды, когда эта очень осторожная птица ничего не слышит и ничего не видит. Это когда у глухаря наступает брачный период. Он так увлекается своей партнёршей, то становится почти глухим, и практически не замечает реальной угрозы со стороны. В это время и попадают глухари в суп к охотникам.

«ТОК»


17 декабря на страницах местной газеты «Вестник Чериковщины» была опубликована большая статья главного редактора О. Глуховой «Взаимодействие с целью созидания», сопровождающаяся многочисленными снимками. В ней автор в радужных красках рассказал о семинаре Могилёвской областной организации республиканского общественного объединения «Белая Русь» («БР»), который, если судить о составе его участников, масштабе проведения и обсуждаемых вопросах, напоминал совещания, проводимые в Могилёвской области под эгидой обкома КПБ во времёна СССР.

«В нём приняли участие заместитель начальника управления идеологической работы, культуры и по делам молодёжи Могилёвского облисполкома О.Корпов, первый заместитель председателя Чериковского райисполкома А. Горбачевский, заместитель председателя Чериковского райисполкома А.Новикова, председатель областного Совета ветеранов А.Любченко, председатели районных организаций РОО «БР» Могилёвской области (в основном высокие чиновники от власти районного масштаба, - автор)… *Открытие семинара состоялось в зале заседания райисполкома* (и, скорее всего, за аренду здания никто не платил, - автор). *Председатель Могилёвской областной организации РОО «БР», ректор Могилёвского государственного университета продовольствия В. Шаршунов, открывая семинар, отметил, что Могилёвская областная организация «БР» вносит значительный вклад в дело стабильного развития общества. По его словам, за семь лет работы организация нашла своё место в социальной системе белорусского общества и укрепилась в нём. - Мы по праву стали общественно-политической силой, объединяющей тех, кому небезразлична судьба нашей страны. Члены нашей организации принимают самое активное участие в разработке и реализации социально-экономических программ, а также решении актуальных вопросов…»,* - пишет О. Глухова. А далее рассказывается о той показухе, которую устроили на базе агрогородка «Езёры» местные чиновники для высокопоставленных гостей с непременным фотографированием последних с маленькими детками, которым высокопоставленные дяди от власти привезли подарки, купленные за счёт бюджетных денег (читай - карманов избирателей). Реальные проблемы экономики, социальной сферы, благосостояния людей их мало волновали, по крайней мере, об этом ничего не написала член «БР», главный редактор газеты «ВЧ» О. Глухова.

ОКРУЖАЩАЯ ОБСТАНОВКА

О том, как в реальной жизни, а не на показушном мероприятии в Езёрах, выглядят плоды «самого активного участия в разработке и реализации социально-экономических программ, а также решения актуальных вопросов» членов Могилёвской областной организации чиновников под названием «БР» независимые журналисты писали не раз. Знаем, что большинству чиновников Кричевского, Климовичского, Краснопольского и Чериковского районов наши оценки их деятельности не нравятся, они всячески от этого отмахиваются и заявляют, что мы собираем сплетни. Поэтому мы ознакомим наших читателей с оценкой работы чиновников Могилёвской области, в том числе и членов «БР», данной главной газетой белорусской власти - «Советской Белоруссией», в №213 от 6.11. 2014 г. в передовой статье «Мы сами строим страну».

5 ноября этого года А. Лукашенко посетил Могилёвскую область и посетил ряд предприятий г. Могилёва. *«Кульминацией же этой поездки стало совещание в облисполкоме по вопросам развития региона… Решение о проведении такого серьёзного совещания стало неожиданностью не только для журналистов, но и для руководства области. Однако, уточнил А.Лукашенко, никакой чрезвычайщины в этом нет. Заканчивается производственный и финансовый год. В следующем нас ожидает важная политическая кампания. Любые выборы - всегда серьёзный экзамен для власти. Поэтому важно уже сейчас подвести некоторые промежуточные итоги социально-экономического развития по каждому региону, обозначить проблемы, недоработки и определить пути их решения. А начать решили с Могилёвской области по той причине, что этот регион по многим показателям отстаёт от других областей и в целом от средне-республиканского уровня. По ряду позиций и вовсе пошёл откат назад. Помощник президента, главный инспектор по Могилёвской области Г.Лавренков основную проблему видит в стиле управления. В облисполкоме проводятся многочисленные совещания, и при этом отсутствуют чёткая постановка задач и должный*



контроль за их исполнением. Не удалось выработать системный подход к подбору кадров. Всё это ведёт к провалам и срыву выполнения поручений президента. Простой пример: в области (и в Чериковском районе, - автор) *построили десятки новых ферм, но нет животных, чтобы их заполнить. Да и с кормовой базой проблемы. А. Лукашенко недоумевает: как можно в этом благоприятном году не заготовить кормов? И вывод: если кто-то из руководителей элементарно не справляется, его надо освобождать от работы без права дальнейшего трудоустройства на руководящую должность. Ряд негативных фактов привёл Председатель Комитета госконтроля Л. Анфимов. Президент критикует председателя облисполкома: в регионе самая низкая в стране зарплата. При этом встречаются факты дебиторской задолженности, когда некоторые предприятия не получают деньги за отгруженную продукцию. АГ выдвигает железное требование: товар без оплаты не давать!»*

За прошедший после совещания в Могилёве период ситуация в экономике и социальной сфере Беларуси и Могилёвской области не улучшилась - об этом говорят АГ, премьер - министр и другие высокопоставленные чиновники. Большинство присутствующих на семинаре «БР» в Черикове представляют сельскохозяйственные районы области. В этом смысле для наших читателей будет интересна оценка ситуации в сельскохозяйственной отрасли страны и пути решения проблем со стороны курирующего её вице-премьера М. Русого, прозвучавшая на его встрече с депутатами обеих палат парламента в конце ноября этого года. Когда депутаты спросили, чего не хватает белорусскому селу, чтобы настала диктатура технологии, вице-премьер ответил: *«Не хватает трёх составляющих: мозгов, организационной работы и спроса»*. И продолжил, что есть, и *«чего тут душой кривить, полный дебилизм отдельных руководителей»*. К слову, более 60% председателей райисполкомов - вчерашние председатели СПК, и к ним нужно присматриваться: *«Для государства важно, в каких условиях мы сформировали этих руководителей. Как они работали у себя - этот они переносят на регион»*.

ПОСЛЕСЛОВИЕ

Более чем убедительно всё вышесказанное подтверждает информационное сообщение, которое появилось в СМИ Беларуси 22-23 декабря. В нём речь шла о том, что А.Лукашенко освободил главного чиновника Могилёвской области, члена «БР» П. Рудника от занимаемой должности. Причём важна причина освобождения. *«Ранее Президент предоставлял губернатору Могилёвской области право провести кадровые изменения, чтобы решить проблему низких темпов развития региона. До 15 ноября П. Руднику было поручено заменить «всех, кто находится ниже, начиная от первого заместителя и до предприятий, колхозов и совхозов, сельских советов». По мнению главы государства, этому областному центру* (и всей области, - автор) *остро не хватает мобилизации кадров порядка и ответственности»,* - написала газета «СБ» от 23 декабря.

Анна ВЛАДОВА.

АДУСЮЛЬ ПАКРЫХУ

Інфляцыя ў Беларусі за 2014 год склала 16,2%. У снежні 2014 года спажывецкія цэны на тавары і платныя паслугі ў параўнанні са снежнем 2013 г. выраслі на 16,2%, праінфармаваў прадстаўнік Белстата. Для параўнання: па выніках 2013 г. інфляцыя склалася на ўзроўні 16,5%.

Генпракуратура паведаміла, што 15 сельскагаспадарчых прадпрыемстваў Магілёўскай вобласці спрацавалі са стратамі ў 180 млрд руб. У Быхаўскім, Клімавіцкім, Клічаўскім, Крычаўскім, Чавускім раёнах зніжаецца пагалоўе буйной рагатай жывёлы. У Генеральнай пракуратуры лічаць, што рашэнне праблем шмат у чым залежыць ад каардынацыі мясцовымі ўладамі дзейнасці сельгасарганізацый.

Правяраючыя адзначылі нізкі ўзровень вытворча-тэхналагічнай, працоўнай і выканальніцкай дысцыпліны, невыкананне кіраўнікамі гаспадарак рашэнняў мясцовых органаў улады і кіравання, патрабаванняў кіраўніка дзяржавы аб усталяванні гранічна жорсткай дысцыпліны, беражлівым стаўленні да ўласнасці.

Ёсць факты, калі да кіравання транспартам, які належыць арганізацыі, дапускалі нецвярозых кіроўцаў. Таксама на лініі працаваў транспарт, які не прайшоў дзяржаўны тэхнічны агляд. За гэтыя парушэнні да адміністрацыйнай адказнасці прыцягнулі больш за 300 чалавек. За кіраванне транспартам вадзіцелямі ў нецвярозым выглядзе канфіскавалі транспартныя сродкі ў пяці СВК у Дрыбінскім, Шклоўскім, Асіповіцкім, Чэрыкаўскім і Клімавіцкім раёнах. За 10 месяцаў 2014 г. за знаходжанне на працоўным месцы ў працоўны час у стане алкагольнага ап'янення прыцягнута 268 асоб, якія працуюць у сельскагаспадарчых арганізацыях.

"У 2014 годзе праведзена 64 праверкі, па выніках якіх да дысцыплінарнай адказнасці прыцягнута 240 чалавек, адміністрацыйнай - 42, матэрыяльнай - 405 (на суму 322 млн. руб.), ўзбуджана 6 крымінальных спраў ", - адзначылі ў пракуратуры.

Падрыхтаваў Антон ДУБАЛОМАЎ.

У нас магчыма нават самае немагчымае

На палянцы ў час прывалу адзін з паляўнічых на поўным сур'ёзе расказвае сваім сябрам:

- Пайшлі аднойчы мы на мядзведзя.

- Усё можа быць! – пагаджаюцца слухачы.

- Застрэлілі гэтага звяругу!

- Усё можа быць! – паддакваюць сябры.

- Знялі з яго скуру!

- Усё можа быць!

- Выразалі самы лепшы кавалак мяса, засмажылі на вогнішчы!...

- Усё можа быць! – уважліва слухаючы, адтапырыўшы вушы, пагаджюцца сябрукі-паляўнічыя. І ў знак згоды ківаюць галовамі, цмокаюць вуснамі.

- І тутацькі, - працягвае свой аповед расказчык, - надыходзіць самая адказная хвіліна – трэба гэтую справу замачыць. Кожны паклаў сабе па куску смажаніны для закусі. Дасталі пляшку. І раптам высвятляецца, што няма ў што наліваць – забылі шклянкі (!)... Сабраліся мы і пайшлі дадому, - скончыў сваё апавяданне бывалы паляўнічы.

- А вось гэтага ня можа быць ніколі!!! – закрычалі ў адзін голас людзі са стрэльбамі.

Чытач, безумоўна, зразумеў, што гэта анекдот. Толькі цяжка яму, гаротніку, зразумець, што нам расказваюць анекдоты ўжо больш за дваццаць год! І ўсё, насуперак здаровай логіцы, прымаецца за праўду. А вось выпадкі, аб якіх будзе напісана ніжэй, зусім не анекдатычныя.

Прачытаў у газеце "СНплюс", аб тым, што на медработнікаў Дубравенскага раёну і вобласці ў следчы камітэт паскардзілася маці хлапчука, якому ампутавалі руку ў ходзе лячэння пералому. Той факт, што хлопчыку зрабілі не тое, што патрабавалася, вельмі сумна і шкада, але мяне асабіста гэтае здарэнне ўжо не здзіўляе: **у нас усё можа быць…**

Недзе ў сярэдзіне 1990-х у памяшканні пошты ў самы разгар працоўнага часу сустракаю знаёмага ўрача.

- Штосьці не на працы, - ці то запытаў, ці то проста так, між іншым, мовіў я.

- Як плоцяць, так і працуем, - прагучаў адказ…

І хаця я ведаю вельмі шмат добрых, чуллівых, адказных за сваю справу людзей ў белых халатах, і ў мяне да іх самыя шчырыя, самыя светлыя думкі і памкненні, але адказ, які прагучаў у памяшканні пошты, мяне не здзівіў. Чаму? Тады чытайце далей…

І хоць падзеі, напісаная ніжэй, адбываліся нашмат часу раней, сувязь нябачную паміж імі, я мяркую, чытач зловіць.

У другой палове 1960-х у нашай бальніцы працаваў неўрапатолагам Уладзімір Фёдаравіч Кузняцоў. Я напісаў цалкам яго імя з-за павагі да яго. Ён быў недзе маіх гадоў. Мінчук. Пасля сканчэння сталічнага медыцынскага інстытуту яго прыслалі да нас адпрацаваць свае тры гады. Мы з ім сябравалі. Разам выступалі на сцэне: я акампаніраваў для яго на гітары, а ён спяваў сваю любімую, як мне падавалася, песню "Всё леса, леса, леса в Белоруссии". Дык вось на што я хачу звярнуць увагу чытача і што мяне ўразіла яшчэ тады. Калі Валодзя прыходзіў да мяне, ён адразу тэлефанаваў у 03 і дакладваў, дзе знаходзіцца. Калі мы з ім шлі ў кіно, Валодзя тутацькі заходзіў у касу кінотэатра і дакладваў у "Хуткую" аб сваім месцы "дыслакацыі".

Пры сяброўскай размове Валодзя часцяком мне, ці то ў роспачы, ці то проста ў роздумах, казаў, што ён працаваў токарам у Менску і зарабляў 300 рублёў у месяц (такую зарплату тады атрымліваў першы сакратар райкаму партыі). Кажа, адпрацую змену, прыйду дадому і ніякіх табе ані клопатаў, ані праблем. Вольны чалавек. А тутацькі… Столькі год мазгі "сушыў", і пасля працы – прывязаны да працы, а зарплата – ўсяго сто рэ (!) Трэба дадаць, Валодзя быў чалавекам эрудзіраваным, усебакова развітым, шмат чытаў перыёдыкі, мастацкай літаратуры. А на ўсі гэтыя задавальненні патрабавалася нямала выдаткаў з асабістай кішэні. І вось – фішка! **Валодзя ў якіх штанах і шапцы да нас прыехаў, у тым адгэтуль і з'ехаў.**



Вось, на мой погляд, тая нябачная траекторыя, якая звязвае дзве падзеі мінулага і сучаснага стагодздзяў! У свеце так проста нічога не бывае – любая, падзея, як той нарыў, выспевае, калі да яго не прыняць радыкальнага ўмяшальніцтва… І ў цяперашні час дзяржава не павярнулася тварам да медыцыны (ды і ня толькі да яе!).Вось мы і дачакаліся вынікаў!

Мяркую, што зараз паважаны чытач разумее, чаму мяне ўжо нічога не здзіўляе: **у нас усё можа быць!**

У нас магчыма тое, што ў нармальным грамадстве апрыёры лічыцца немагчымым.

Сямён ПАНІЗОЎЦАЎ.

Магілёўскі ВЫБАР

Грамадска-палітычная газета. Выдаецца на беларускай і рускай мовах, распаўсюджваецца бясплатна. Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі.

Адрас рэдакцыі: 213155, Магілёўская вобласць, Магілёўскі раён, в.Брылі, вул.Юбілейная, 6-7. Тэл. 8-0222-710451
E-mail: mikolabryl@gmail.com. Выдавец Яцкова Ала Міхайлаўна. Наклад 299 асобнікаў. Фармат А-4. Надрукавана на ўласным абсталяванні. Падпісана ў друк 14.02.2015 г. у 10.00.